# ОТ РЕДАКЦИИ
# АД РЭДАКЦЫІ
# EDITORIAL

Сёлета спаўняецца 450 гадоў з моманту заключэння Люблінскай уніі і ўтварэння Рэчы Паспалітай. Дзяржаўны саюз 1569 г. завяршыў гісторыю персанальных уній паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Каронай Польскай, пачаткам якой было падпісанне Крэўскага акта 1385 г. Разам з тым 1 ліпеня 1569 г. у гісторыі Беларусі распачаўся новы, больш чым двухсотгадовы перыяд.

Гісторыя Рэчы Паспалітай надзвычай цікавая і адначасова вельмі неадназначная. Палітычная сістэма гэтай дзяржавы давала магчымасць шырокім колам шляхецтва ўдзельнічаць у абмеркаванні і вырашэнні найважнейшых пытанняў унутранай і знешняй палітыкі. Шляхта карысталася значнымі палітычнымі і сацыяльнымі правамі, у тым ліку правам абіраць караля польскага і вялікага князя літоўскага, а сама форма кіравання Рэчы Паспалітай – *monarchia mixta* – забяспечвала баланс паміж уладай манарха і вышэйшага саслоўя. Федэратыўная аснова новага дзяржаўнага ўтварэння дазваляла Вялікаму Княству Літоўскаму захаваць сваю дзяржаўнасць і часткова суверэнітэт. Аднак з сярэдзіны XVII ст. стварэнне магутных магнацкіх груповак, злоўжыванне залатымі шляхецкімі вольнасцямі, крызіс парламенцкай сістэмы, адсутнасць эфектыўнай выканаўчай улады і ўплыў знешніх фактараў прывялі Рэч Паспалітую да стану глыбокага заняпаду і ўвогуле яе ліквідацыі. Тым не менш рэформы, ухваленыя на Чатырохгадовым сойме 1788–1792 гг., асабліва прынятце Канстытуцыі 3 мая 1791 г., сведчылі пра вялікі рэфарматарскі патэнцыял палітычных народаў ВКЛ і Польшчы. Не варта таксама забываць, што ў другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай выразна праявіліся тэндэнцыі да мадэрнізацыі састарэлага, яшчэ феадальнага эканамічнага і сацыяльнага ладу.

Рэч Паспалітая была дзяржавай шматканфесійнай і шматэтнічнай. Доўгі час палітычная сістэма, пабудаваная менавіта на прынцыпах шляхецкай дэмакратыі, забяспечвала мірнае суіснаванне розных этнасаў і канфесійных груп. На жаль, паступовы адыход дзяржаўнай улады ад палітыкі рэлігійнай талерантнасці прывёў Рэч Паспалітую да вельмі цяжкіх сацыяльных канфліктаў XVII ст. Аднак супрацьстаянне паміж канфесіямі выклікала не толькі сутыкненні, але і актывізацыю культурнага жыцця. Так, рэлігійная палеміка канца XVI – пачатку XVII ст. вакол заключэння Берасцейскай уніі стала адным з самых значных інтэлектуальных працэсаў у гісторыі Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на ўсе цяжкасці і супярэчнасці, да канца XVIII ст. у дзяржаве працягвалі жыць побач вернікі розных хрысціянскіх і нехрысціянскіх канфесій, а таксама прадстаўнікі розных народаў.

Неадназначным быў перыяд Рэчы Паспалітай і для ўласна беларускага этнасу. Польская мова, якая стала мовай палітыкі, культуры, адукацыі і навукі, ужо з канца XVI ст. усё больш актыўна выцясняла старабеларускую мову з афіцыйнага ўжытку. Палітычныя эліты Вялікага Княства Літоўскага і вярхі мяшчанства імкліва апалячваліся. Аднак яшчэ да сярэдзіны XVII ст. беларуская мова займала трывалыя пазіцыі сярод шырокіх колаў павятовага шляхецтва, а ў асяроддзі простых гараджан і тым больш сялянства яна дамінавала і ў пазнейшыя часы. Уключэнне ў 1569 г. зямель Украіны ў склад Польшчы, з аднаго боку, аслабіла ВКЛ, але з іншага – паскорыла працэсы фарміравання асобных беларускага і ўкраінскага народаў. Цесныя сувязі Рэчы Паспалітай з Заходняй Еўропай паспрыялі актыўнаму пранікненню на нашы землі заходнееўрапейскіх культурных уплываў, іх засваенню і творчай перапрацоўцы на мясцовай аснове. У выніку на працягу XVII–XVIII стст. у Беларусі сфарміравалася адметная духоўная і матэрыяльная культура.

Прадстаўленыя ў тэматычным раздзеле нумара артыкулы закранаюць розныя аспекты гісторыі Рэчы Паспалітай. Уладзімір Падалінскі на прыкладзе

жыцця і дзейнасці двух звычайных віцебскіх шляхціцаў паказаў асноўныя формы сацыяльнай актыўнасці дробнай і сярэдняй шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI ст., адлюстраваў уплыў ваенна-палітычных падзей 1560-х гг. на іх пазіцыю па пытанні заключэння уніі паміж ВКЛ і Польшчай у 1569 г. У матэрыяле Віталя Галубовіча прааналізаваны важныя кантэксты ўжывання тэрміна «унія» ў крыніцах канца XVI – XVII ст., а таксама механізм трансляцыі памяці пра Люблінскую унію і адносіны да яе з боку велікакняжацкай шляхты. Два артыкулы нумара прысвечаны падзеям Вялікай Паўночнай вайны 1700–1721 гг., якая, дарэчы, стала адным з найбольш значных фактараў канчатковага палітычнага і эканамічнага заняпаду Рэчы Паспалітай. У даследаванні Марыуша Савіцкага на аснове новых дыпламатычных крыніц, што захоўваюцца ў архівах Вялікабрытаніі і Польшчы, выяўлены важныя асаблівасці пачатковага этапу баявых дзеянняў у Лівоніі і Рэчы Паспалітай у час гэтай вайны. Аляксандр Слесарэнка праз крытычны аналіз крыніц робіць спробу аднавіць рэальную карціну баявых дзеянняў паміж шведскімі і расійскімі войскамі на землях Беларусі ў 1708 г. Нарэшце, Святлана Лугаўцова ў сваім артыкуле разглядае сацыяльна-эканамічныя параметры жыцця дробнай шляхты Лепельскага павета ў першыя дзесяцігоддзі пасля яго далучэння да Расійскай імперыі. Нумар часопіса, які чытач трымае ў руках, дазволіць больш глыбока і ўсебакова зразумець спецыфіку гістарычнага развіцця беларускіх зямель у перыяд існавання Рэчы Паспалітай.

Яшчэ адзін раздзел бягучага нумара датычыцца гісторыі мастацтваў і прысвечаны памяці выдатнага навукоўца, былога дэкана гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава Івана Іванавіча Тучкова, які сышоў з жыцця восенню 2018 г. У гэтым раздзеле размешчаны матэрыялы яго калег і вучняў, прысвечаныя шэрагу праблем перш за ўсё гісторыі мастацтва Італіі. У артыкуле А. С. Смаголь разглядаецца спецыфіка мастацкага вобраза *Volto del Cavallo* – рэнесанснага партала палаца д'Эстэ ў Ферары. Помнік аналізуецца ў кантэксце катэгорый часу, прасторы, славы і памяці, кожная з якіх была накіравана на ўмацаванне прэстыжу і права пераемнасці ўлады роду д'Эстэ ў рэгіёне. На адзін з ключавых пісьмовых помнікаў ферарскай кніжнай мініяцюры Ранняга Адраджэння – брэвіярый Эрколе I д'Эстэ звярнула ўвагу Д. А. Чуркіна. На падставе яго вывучэння аналізуе асаблівасці развіцця класічнай традыцыі ў мастацтве Ферары ў гэты перыяд. Разгляду творчасці Мікеланджэла прысвечана даследаванне П. А. Алёшына, які аналізуе пытанне ўзаемаадносін паміж паэзіяй і скульптурай мастака, праблему незавершанасці некаторых яго позніх скульптурных твораў, а таксама прыводзіць пераклады некаторых паэтычных твораў Мікеланджэла.